**В. І. Саітава,** *дацэнт кафедры тэорыі
і гісторыі інфармацыйна-дакументных
камунікацый, кандыдат педагагічных навук,
дацэнт*

# КІРАВАННЕ САМАСТОЙНАЙ РАБОТАЙ СТУДЭНТАЎ-ЗАВОЧНІКАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ РАЗДЗЕЛА «ГІСТОРЫЯ» ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВА»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самастойная работа студэнтаў завочнай формы навучання з'яўляецца важным складнікам засваення вучэбных дысцыплін і забяспечвае больш глыбокае набыццё прафесійных ведаў. Паняцце «самастойная работа студэнтаў» выкарыстоўваецца ў наступных асноўных сэнсах: як аўдыторная і пазааўдыторная формы арганізацыі вучэбнага працэсу і як спосаб індывідуалізацыі навучання [4]. З самастойнай работай звязваюцца задачы фарміравання ў студэнтаў інтарэсу да гісторыі бібліяграфіі, працэсу навучання, прафесійнай матывацыі, прафесійнай самаадукацыі і псіхалагічнай гатоўнасці да самастойнага авалодання ведамі.

Прызначэнне гэтай дысцыпліны заключаецца ў тым, каб студэнты пазнавалі працэс развіцця бібліяграфіі, яе асноўныя тэндэнцыі, заканамернасці, інфраструктурны характар, узнікненне новых бібліяграфічных з'яў. У межах гісторыі бібліяграфіі ўсе разнастайныя бібліяграфічныя з'явы і факты разглядаюцца цэласна, ацэначна, у храналагічнай паслядоўнасці асноўных гістарычных перыядаў. На наш погляд, гэта спрые развіццю інтарэсу студэнтаў да засваення гісторыка-бібліяграфічных ведаў. Садзейнічанне вучэбна-прафесійнай матывацыі і прафесійнай самаадукацыі, якія ў студэнтаў-завочнікаў цесна звязаны, дасягаецца адлюстраваннем у змесце СРС заданняў, а таксама крыніц, з якімі трэба працаваць падчас іх выканання, яркіх фактаў, падзей, важнейшых тэндэнцый развіцця бібліяграфіі, самаахвярнай працы выдатных бібліёграфаў, якія працавалі ў бібліятэках, кніжным гандлі – тых грамадскіх інстытутах, дзе працаўладкоўваецца большасць нашых студэнтаў. Асэнсаванне ўласнага ўнёску ў справу забеспячэння інтэлектуальнага доступу да масіваў і патокаў фіксаваных тэкстаў, над чым вякамі працавалі бібліёграфы, можа павышаць матывацыю да набыцця трывалых гісторыка-бібліяграфічных ведаў як часткі запатрабаваных прафесійных ведаў бібліятэкара-бібліёграфа [3].

Мяркуем, што гэта дазваляе ўздзейнічаць на эмацыянальна-пачуццёвую сферу студэнтаў і іх пазнавальныя інтарэсы.

Псіхалагічная гатоўнасць да выканання самастойнай работы таксама фарміруецца шляхам тлумачэння значнасці і карысці гісторыка-бібліяграфічных ведаў. Звяртаецца ўвага на важнасць авалодання гістарычным вопытам бібліяграфіі, які з’яўляецца ўвасабленнем адной з галоўных заканамернасцей яе развіцця: бібліяграфія не губляе нічога каштоўнага за час свайго развіцця [1].

У мэтах фарміравання станоўчай матывацыі і псіхалагічнай гатоўнасці да самастойнай работы раскрываецца і сістэма ацэнак, якія можа атрымаць кожны студэнт.

Актуалізуе разглядаемую праблему і тое, што ў частцы студэнтаў засваенне і асэнсаванне гісторыка-бібліяграфічнага матэрыялу выклікае немалыя цяжкасці. Сярод разнастайных прычын слабай паспяховасці, думаецца, ёсць такая, як недастатковасць сувязей вывучаемага матэрыялу з набытым асабістым вопытам (прафесійным) і аб’ёмам набытых ведаў. На жаль, па дысцыпліне «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» скасавана пісьмовая кантрольная работа, якая лічыцца адной з найбольш эфектыўных форм самастойнай работы і ў якой былі добра распрацаваны заданні, прысвечаныя персаналіям і аналізу бібліяграфічнай дзейнасці на больш дробных гістарычных этапах. Усё вышэйсказанае ўлічваецца пры арганізацыі і кіраванні СРС па дысцыпліне на ФЗН.

Таму падчас трэцяга семестра навучання, калі пачынаецца вывучэнне дысцыпліны, студэнты атрымліваюць падрабязную кансультацыю аб важнасці сістэматычнай самастойнай працы ў міжсесійны перыяд і самастойнай працы на аўдыторных занятках. Звяртаецца ўвага на неабходнасць засваення асноўнага фактычнага матэрыялу, што характэрна для гістарычных дысцыплін: падзей і з’яў, а таксама іх тлумачэння, аналізу, уплываў на развіццё бібліяграфіі. Даецца падрабязная вусная кансультацыя аб выкананні СРС і аб значэнні гэтай працы ў бягучай і выніковай ацэнцы ведаў. Студэнты атрымліваюць электронныя версіі вучэбнай літаратуры, электронную копію ВМК па курсе, дзе ўтрымліваюцца заданні для самастойнай работы, знаёмяцца з яе метадычнымі распрацоўкамі.

Асновай арганізацыі СРС па дысцыпліне з'яўляюцца тыпавая вучэбная праграма па курсе, вучэбна-метадычны комплекс, вучэбныя выданні. Тыпавая вучэбная праграма 2011 г. выдання ахоплівае 12 тэм, з якіх 7 прысвечаны сусветнай і 5 гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай бібліяграфіі. Вучэбна-метадычны комплекс (прадстаўлены ў электроннай бібліятэцы) змяшчае ўсе неабходныя элементы, у тым ліку падрабязна распрацаваны раздзел СРС. Для студэнтаў-завочнікаў у комплексе выдзелены матэрыялы, якія дапамагаюць ажыццяўляць самастойную падрыхтоўку ў міжсесійны перыяд. Гэта пытанні да заліку, тэматыка семінарскіх і практычных заняткаў, спіс літаратуры па курсе, а таксама падрабязныя метадычныя матэрыялы для выканання кіруемай самастойнай работы.

Значную дапамогу ў вывучэнні вучэбнага матэрыялу і асабістым самакантролі могуць аказаць тэсты. У ВМК уключаны тэсты па ўсіх перыядах айчыннай гісторыі бібліяграфіі і шэраг тэстаў па сусветнай гісторыі бібліяграфіі, а таксама выніковы тэст па курсе ў цэлым. Большая частка заданняў утрымлівае варыянты адказаў, але ёсць і іншыя заданні: на адпаведнасць, паслядоўнасць. Студэнтам тлумачыцца, што ў хатніх умовах яны з дапамогай саматэсціравання могуць вызначыць узровень падрыхтаванасці і гатоўнасці да заліку.

Важнейшай крыніцай самастойнай працы студэнтаў у міжсесійны перыяд з'яўляецца падручнік. Па дысцыпліне «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» адзінага падручніка ці вучэбнага дапаможніка няма. Рэкамендуюцца для вывучэння падручнік В.Е. Лявончыкава «Беларуская бібліяграфія. Агульны курс» (1981, 1991), у якім змешчаны гістарычны раздзел, тэксты лекцый «Гісторыя беларускай бібліяграфіі» (В. І. Саітава, Т. В. Кузьмініч), прадстаўленыя ў электроннай бібліятэцы, і вучэбны дапаможнік «Сусветная гісторыя бібліяграфіі» (В. І. Саітава, 2005). У сукупнасці гэтыя крыніцы забяспечваюць вывучэнне гісторыка-бібліяграфічнага працэсу ў свеце і Беларусі. Тым не менш пытанне аб новым вучэбным выданні, якое б аб'яднала ўвесь матэрыял, сінтэзавала яго і ахапіла навейшыя з'явы і тэндэнцыі этапу электроннай бібліяграфіі, а таксама прадставіла б яго адпаведна сучасным патрабаванням да зместу і формы вучэбных выданняў, з'яўляецца актуальным. Неабходна ўдасканальваць крытычны аналіз гістарычнага бібліяграфічнага працэсу, адбор фактаў для засваення студэнтамі, актуалізаваць іх інтэрпрэтацыю, аптымальна выкарыстоўваць метадычныя сродкі, якія дазваляюць студэнтам паспяхова засвойваць прапанаваны матэрыял.

У арганізацыі і кіраванні СРС улічваюцца прынцыпы: стартавых ведаў, даступнасці, індывідуалізацыі, выкарыстання новых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйных тэхналогій. Таксама пастаянна ўдакладняюцца мэты, змест, заданні, формы СРС, формы кантролю за паспяховасцю выканання СРС.

Стартавыя веды для вывучэння дысцыпліны забяспечаны шэрагам вучэбных курсаў, такіх як «Гісторыя Беларусі», «Сусветная гісторыя», у якіх вывучаюцца перыядызацыя і вядучыя грамадскія тэндэнцыі; «Дакументалогія» – уяўленні аб дакументных аб’ектах бібліяграфічнай дзейнасці; «Бібліятэказнаўства. Тэорыя», «Бібліятэказнаўства. Гісторыя», якія фарміруюць веды аб бібліятэцы як адным з асноўных сацыяльных інстытутаў функцыянавання бібліяграфіі з часоў старажытнасці. Істотнае значэнне маюць тэарэтычныя бібліяграфічныя веды («Бібліяграфазнаўства. Тэорыя»), якія закладваюць уяўленні аб бібліяграфічных з’явах, формах існавання бібліяграфічнай інфармацыі, заканамернасцях развіцця бібліяграфіі і інш.

Метадычнае забеспячэнне СРС па дысцыпліне «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» змяшчае індывідуалізаваныя заданні, парады па выкарыстанні рэсурсаў электроннай бібліяграфіі.

Самастойнае вывучэнне вучэбнага матэрыялу студэнтамі-завочнікамі па-магчымасці павінна ажыццяўляцца паслядоўна. Гэта няпроста здзейсніць у сілу спецыфікі завочнага навучання. Але ў пэўнай ступені забяспечвае паслядоўнасць засваення матэрыялу сувязь паміж бібліяграфічнымі з’явамі і фактамі, асэнсаванне бесперапыннасці бібліяграфічнага працэсу, размеркаванне заданняў у адпаведнасці з асноўнымі гістарычнымі перыядамі развіцця бібліяграфіі.

Два з трох асноўных раздзелаў курса «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя» забяспечаны заданнямі, якія патрабуюць самастойнай працы ў міжсесійны перыяд. Для завочнікаў прапанаваны тры тэмы семінарскіх заняткаў, якія ахопліваюць гісторыю беларускай бібліяграфіі міжваеннага перыяду, калі сфарміраваліся яе асноўныя арганізацыйныя структуры, і сучасны этап сусветнай бібліяграфіі. Падчас сесіі ў чацвёртым семестры выконваюцца практычныя работы, якія дапамагаюць засвоіць і крытычна ацаніць развіццё методыкі бібліяграфавання ў XIX – пачатку XX ст.

На міжсесійны перыяд студэнты атрымліваюць індывідуалізаваныя заданні па кіруемай самастойнай рабоце: пазнаёміцца з інтэрнэт-рэсурсамі нацыянальнай бібліяграфіі розных краін і ажыццявіць у іх розныя віды бібліяграфічнага пошуку. Гэта заданне прысвечана раздзелу III «Бібліяграфія на сучасным этапе» (Тэма 10.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё нацыянальнай бібліяграфіі ў асобных краінах свету і рэгіёнах). Яго карысць заключаецца ў тым, што значнасць рэсурсаў нацыянальнай бібліяграфіі ў віртуальным асяроддзі няўхільна ўзрастае, а іх выкарыстанне з’яўляецца неабходным прафесійным уменнем бібліятэкараў-бібліёграфаў. Таксама ўлічваецца і тое, што ва ўніверсітэце пакуль няма ўмоў для правядзення аўдыторных заняткаў з вялікімі групамі студэнтаў.

Важную ролю ў вывучэнні гісторыі бібліяграфіі маюць звесткі, прысвечаныя выдатным дзеячам. Па выбары студэнты рыхтуюць у пісьмовай форме невялікія рэфераты ці электронныя прэзентацыі аб дзеячах айчыннай і замежнай бібліяграфіі. Часткова гэтыя матэрыялы выкарыстоўваюцца на семінарскіх занятках, а таксама на заліку. Расійскія калегі таксама падкрэсліваюць, што ў вывучэнні гісторыі бібліяграфіі асаблівая ўвага надаецца ўкладу выдатных бібліёграфаў [2].

У працэсе самастойнай работы студэнтаў значэнне мае праца з літаратурнымі крыніцамі. Гэты від работы актыўна выкарыстоўваецца і ў дысцыпліне «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя». Яшчэ адным заданнем на міжсесійны перыяд з’яўляецца вывучэнне навуковых артыкулаў ці іншых матэрыялаў, прысвечаных гісторыі бібліяграфіі. Студэнты рыхтуюць канспекты ці электронныя прэзентацыі трох публікацый, якія прысвечаны з’явам бібліяграфіі ў розныя гістарычныя перыяды. Спіс важнейшых публікацый апошніх год прапанаваны ў метадычнай распрацоўцы гэтага задання, але таксама ўказаны крыніцы для самастойнага пошуку матэрыялаў. Гэта заданне скіравана на выпрацоўку ўменняў выяўляць, крытычна ацэньваць, абагульняць літаратуру па вывучаемай галіне ведаў, вывучаць бібліяграфічныя з’явы ў дынаміцы грамадскага жыцця, іх залежнасць ад культурнага, матэрыяльна-тэхнічнага, эканамічнага фактараў.

Усе падрыхтаваныя студэнтамі матэрыялы і самастойна набытыя веды выкарыстоўваюцца падчас аўдыторных заняткаў па дысцыпліне і ў бягучым, і ў выніковым кантролі ведаў. Напрыклад, гутарка са студэнтамі па пытаннях развіцця бібліяграфіі, узнятых у публікацыях, ідзе і на заліку. Тэсты выкарыстоўваюцца часам і для прыёму заліку (асноўная форма заліку – вусны адказ па пытаннях).

Такім чынам, укараняюцца творчыя формы самастойнай работы студэнтаў, стымулюючыя іх да актыўнай пазнавальнай і прафесійнай дзейнасці. Для ўліку вынікаў СРС выкарыстоўваецца бягучы кантроль падчас аўдыторных заняткаў, кантроль атрыманых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заданняў на міжсесійны перыяд, выніковы кантроль (залік). Кожнае выкананае заданне ўлічваецца і ацэньваецца індывідуальна і фарміруе пэўны рэйтынг кожнага студэнта.

На жаль, пакуль мала выкарыстоўваюцца на завочным навучанні такія грунтоўныя віды самастойнай работы, як напісанне курсавых і дыпломных работ. Гэты кірунак варта развіваць больш актыўна.

Праца, звязаная з арганізацыяй самастойнай работы і ацэнкай яе вынікаў, ажыццяўляецца выкладчыкам у свой вольны час і ў тэрмін да прыёму заліку. Камунікатыўныя, зваротныя сувязі са студэнтамі-завочнікамі былі б больш прадуктыўнымі, калі б час на яе планаваўся ў вучэбнай нагрузцы выкладчыкаў.

---

1. *Вохрышева, М. Г.* Теория библиографии : учеб. пособие / М. Г. Вохрышева. – Самара : Самар. гос. акад. культуры и искусств, 2004. – 367 с.

2. *Головко, С. И.* Преподавание истории российской библиографии в СГУ : персонифицированный подход / С. И. Головко // Библиография. – 2011. – № 3. – С. 30–33.

3. *Макклелланд, Д.* Мотивация человека : пер. с англ. / Д. Макклелланд. – СПб. : Питер, 2007. – 672 с. – (Мастера психологии).

4. *Сергеенкова, В. В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В. В. Сергеенкова. – Минск : РИВШ, 2005. – 131 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ